Роднай газеце на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 ЖНІЎНЯ 2009 г. АЎТОРАК № 153 (26511)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.




## Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным актывізаваць вывучэнне замежных моў у навучальных установах Беларусі

**Аб гэтым і іншых пытаннях ішла размова 17 жніўня ў час даклада кіраўніку дзяржавы міністра адукацыі Аляксандра Радзькова.**

Міністр адзначыў, што ў агульнаадукацыйных школах завершаны пераход на 11-гадовую сістэму адукацыі. Як паказалі вынікі выпускных і ўступных экзаменаў, у школах створаны неабходныя ўмовы для атрымання якаснай адукацыі. Што датычыцца вынікаў уступнай кампаніі, цяпер укамплектаваны студэнтамі ВНУ, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, гэта работа завяршаецца ў прафтэхвучылішчах.

Прэзідэнту далажана аб завяршэнні аптымізацыі сістэмы адукацыі ў цэлым, аб наяўнасці ў краіне неабходнай колькасці ВНУ, прафтэхвучылішчаў, школ. Між тым існуюць праблемы з маленькімі сельскімі школамі, дзе сёння складана наладжваць якасны вучэбны працэс. У такіх выпадках размова можа ісці аб узбуйненні школ, пры гэтым паралельна неабходна вырашаць праблему падвозу дзяцей у школы. Прэзідэнт Беларусі наконт гэтага заўважыў, што асабліва актыўна неабходна выкарыстоўваць патэнцыял аграгарадкоў, у якіх ствараюцца добрыя ўмовы для навучання дзяцей. Аляксандр Лукашэнка паставіў перад Міністэрствам адукацыі задачу забяспечыць высокі ўзровень адукацыі на ўсіх этапах: у агульнаадукацыйнай школе, прафтэхвучылішчы, тэхнікуме, каледжы, універсітэце. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць больш актыўнага выкарыстання ў вучэбным працэсе новых тэхналогій, а таксама забеспячэння высокай якасці навучальных дапаможнікаў. Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным з улікам сучасных патрабаванняў актывізаваць работу па вывучэнні замежных моў. Паводле слоў міністра, у найбліжэйшыя гады плануецца ўвесці выпускны экзамен у школе па замежнай мове ў вуснай форме. У некаторых беларускіх ВНУ будуць арганізаваны цэлыя патокі на англійскай мове навучання не толькі для нашых студэнтаў, але і для іншаземцаў. Як чакаецца, у гэтым годзе атрымліваць адукацыю ў беларускіх навучальных установах будуць каля 7 тыс. замежных студэнтаў.

Аляксандр Радзькоў паведаміў аб гатоўнасці 90 працэнтаў школ да пачатку навучальнага года. Падрыхтоўка астатніх будзе завершана ў найбліжэйшыя дні. Навучальныя ўстановы ўкамплектаваны настаўнікамі, выкладчыкамі. Да пачатку новага навучальнага года здаюцца 4 новыя школы, 4 дзіцячыя садкі, у Баранавіцкім універсітэце пабудаваны інтэрнат, у Полацкім універсітэце — вучэбны корпус. Да канца года плануецца ўвесці яшчэ 2 школы і некалькі дзіцячых садкоў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## «НОВАЕ ЖЫЛЛЁ? РЭАЛЬНА!»

**Людзей усё часцей пачало цікавіць менавіта будаўніцтва новага жылля. Гэтая тэндэнцыя праявілася гэтым летам, калі бескватэрныя жыхары гарадоў амаль перасталі звяртаць увагу на другасны рынак жылля. Сёння нават камерцыйнае жыллё будуецца танней, выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі, дамы ўзводзяцца хутка.**

### *«Далёўкай» зацікавіўся сярэдні клас*

У майго добрага знаёмага два сыны, а жонка працуе ў прыватным банку. Даход у сям'і не вельмі маленькі, але жывуць яны ў стандартнай двухпакаёвай кватэры на апошнім дзявятым паверсе дома ў спальным раёне сталіцы. Яны даўно ўжо збіраліся набыць сабе больш прасторнае і якаснае жыллё, але проста купіць вялікую кватэру нават для гэтай сям'і было праблематычна. Прычына ў тым, што яшчэ летась нават невялікая трохпакаёвая кватэра на другасным рынку жылля Мінска каштавала больш як 100 тысяч долараў. Камерцыйнае будаўніцтва таксама было не вельмі зручным, бо квадратны метр каштаваў да 2 тысяч долараў, а трохпакаёвая кватэра ў дамах павышаных спажывецкіх якасцяў мела агульную плошчу каля 85—100 квадратных метраў.

> **Калі ў абласных гарадах квадратны метр жылля долевага будаўніцтва каштуе сёння 700—800 долараў, то прыкладна да гэтай мяжы «далёўка» можа патаннець і ў сталіцы?**

Істотна патаннелі кватэры на другасным рынку сталіцы і абласных цэнтраў краіны, але не гэта галоўнае. Цяпер у новых чаргавікоў, а таксама тых, хто афіцыйна не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з'явілася магчымасць будаваць сабе жыллё па лініі долевага будаўніцтва па значна меншым кошце. Кошт жыллёвага квадрата па «далёўцы» складае цяпер усяго 1000—1200 долараў і нават ніжэй.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Шануй сваё!

## МОТАЛЬ: КЛАНДАЙК ДЛЯ ЭТНОГРАФА І РАЙ ДЛЯ ГУРМАНА

*У нядзелю ў адной з самых вялікіх і самабытных вёсак Беларусі адбыўся Другі міжнародны фестываль «Мотальскія прысмакі»*



**Тыя, хто быў на падобным фестывалі летась, прыклалі ўсе намаганні, каб патрапіць на яго і сёлета. Нездарма леташні фэст быў прызнаны на Рэспубліканскім конкурсе «Пазнай Беларусь» Падзеяй года. Моталь сапраўды для многіх стаў адкрыццём. Пра Моталь чулі, у 90-я гады сюды прыязджалі па знакамітыя кажушкі з Алтая, Польшчы, Украіны... У турыстычныя маршруты па Палессі шмат гадоў ужо ўключаны і карыстаецца вялікай папулярнасцю Мотальскі музей народнай творчасці.**

Аднак фестываль дазволіў не толькі маталянам больш поўна раскрыць сябе, а гасцям убачыць на свае вочы ўнікальнасць гэтага мястэчка, але адбылося ў некаторай ступені пагружэнне ў самабытную культуру Моталя, якая ўсіх зачаравала, нікога не пакінула абыякавым. Асабліва ўразіла тое, што тут, у Моталі, не было ніякай штучнасці, стылізацыі, «работы» на турыста, як гэта бывае практычна на ўсіх турыстычных аб'ектах. Усё тут было арыгінальным, аўтэнтычным і натуральным. І мова, і адзенне, і караваі, і каўбаса, і рыба...

Госці фестывалю жылі ў звычайных вясковых хатах, гаспадары дзялілі з імі свой сняданак і вячэру. І гэта было ледзь не самым моцным уражаннем. Бо гэта і было сапраўдным пагружэннем, хай сабе і на няпоўныя суткі, у жыццё маталян. Потым, вяртаючыся дадому, мінчане, расіяне і замежныя госці наперабой расказвалі адно аднаму, якія цудоўныя, гасцінныя і цікавыя ў іх былі гаспадары, у якіх добрых, заможных дамах яны жывуць, як смачна і шчодра частуюць, як нязвыкла размаўляюць...

Безумоўна, уразіў і сам фестываль, сваім размахам, якасцю арганізацыі, разнастайнасцю мерапрыемстваў і багаццем фантазіі ўдзельнікаў, а таксама магчымасцю набыць тут унікальныя рэчы і вельмі смачныя прадукты. Таму не дзіва, што на сёлетняе свята з'ехалася ледзь не ўдвая больш народу. Машынамі і аўтобусамі, у тым ліку вялікімі турыстычнымі, былі запоўнены ўсе прылеглыя да галоўнай плошчы вуліцы. Да мясцовых жыхароў спецыяльна на гэтыя дні з'ехаліся сваякі з усіх куткоў свету, так што некаторыя дамы папоўніліся на 10—15 чалавек. Вялікую плошчу Моталя раніцай нядзелі запоўніла людское мора.

І трэба сказаць, што Моталь зноў прадэманстраваў высокі ўзровень усяго, за што тут бяруцца. Усе госці былі сытна накормленыя, нягледзячы на вялікую колькасць народу, усім на плошчы хапала месца, не было ніякіх нязручнасцяў, накладак. Цікавая была канцэртная праграма, у рамках якой было расказана пра самы старажытны і жывы дагэтуль у Моталі вясельны абрад, а таксама адбыўся конкурс вясельных караваяў. Разнастайным быў і гандаль, прыгожымі — выстаўкі і гандлёвыя рады... Але нечага сёлета ўсё ж не хапала. Можа, прычына ў непазбежнай страце адчування навізны, а можа — у імкненні арганізатараў укласціся ў зручную, звыклую схему «святаў вёскі». Іншымі словамі, фестываль атрымаўся трошкі больш прычэсаным, але менш каларытным.

Чамусьці сёлета не было тут кроснаў, з якіх летась «гарачымі» прадаваліся ручнікі па 25 тысяч, менш было старых, аўтэнтычных рэчаў — толькі бездзежскія фартушкі па 40—60 тысяч і ручнікі. Летась, напрыклад, тут можна было купіць цалкам народны строй, пашыты 50—100 гадоў таму. Гаспадары вясковых сядзіб увозілі адсюль бярэмя старых і таму танных посцілак, дарожак. Усё гэта — лепшае ўпрыгажэнне пакояў для турыстаў. Напэўна, гэта натуральна, што колькасць старых рэчаў паменшылася, хоць, кажуць, што іх яшчэ дастаткова і ў Моталі, і ў суседніх вёсках. Шкада, што амаль не было на фестывалі рэчаў недарагіх. Напрыклад, на гэты раз новыя саматканыя посцілкі і абрусы прадаваліся па 150—180 тысяч.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### «ДРУГІ ХЛЕБ» СТАЎ ЛІДАРАМ ПАДАРАЖАННЯ

**Найбольшы рост цэнаў — на бульбу, чай, медыкаменты, тытунь і парфум.**

Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, у ліпені ў параўнанні са снежнем мінулага года цэны на прадукты харчавання ў сярэднім узраслі на 5,2 %. За гэты перыяд зменшыліся расцэнкі на алей (на 10,5 %) і на гародніну (на 17,1 %, хутчэй за ўсё — за кошт сезонных ваганняў). Аднак, што цікава, садавіна, наадварот, падаражэла на 14,6 %. Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, найменшыя змяненні цэннікаў у параўнанні са снежнем 2008 г. адзначаліся на малако і малочныя прадукты (на 1,5 %), крупы і бабовыя (на 1,7 %), хлеб і хлебабулачныя вырабы (на 2,8 %) і мяса (на 2,9 %). У межах ад 3 да 6 % падаражэлі каўбасныя вырабы і вяндліна, масла, пшанічная мука, макаронныя вырабы, яйкі, ад 7 да 12 % — цукар і кандытарскія вырабы, рыба і морапрадукты, селядцы, рыбныя кансервы, алкагольныя напоі. Найбольшы рост сярод тавар-ных пазіцый адзначаўся на чай (рост цэнаў склаў 27,1 %), а таксама... на бульбу (падаражэла больш чым удвая — абсалютны лідар па падаражанні!). Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, цэны на нехарчовыя тавары за адпаведны перыяд узраслі на 7,8 %. Найбольшы рост — на медыкаменты (на 21,1 %), парфумерна-касметычныя тавары (на 17,6 %) і тытунь (на 13 %).

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

### ШТАРМАВОЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ: ЛІЎНІ І ГРАД

**З аўторка да нас завітае моцны атмасферны фронт, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Сёння ўдзень на ўсёй тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах дажджы моцныя. Пры навальніцах моцны парывісты вецер. Тэмпература 19—25, у Гомельскай вобласці — да 29 градусаў. У сераду пахаладае. У ноч на сераду 8—14, удзень 16—23. У чацвер ападкі спыняцца. Уначы 5—12, удзень 16—22 да 24 градусаў. У выхадныя — сонечнае надвор'е. Уначы 6—13, удзень ад 17 па поўначы да 26 цяпла па поўдні.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### АД ЖОНКІ Ў ШЛЁПАНЦАХ... ДА ЯЛТЫ

**Амаль па Булгакаву разыгрываўся сюжэт у звычайнай баранавіцкай сям'і. Памятаеце, у рамане «Майстар і Маргарыта» дырэктар тэатра «Вар'етэ» Сцёпа Ліхадзееў раптам апынуўся ў Ялце і тэлеграфаваў адтуль на працу?**

Наш герой у гарачы поўдзень выйшаў з дому па прахаладжальны напой. Выйшаў, як цяпер прынята, у шортах і шлёпанцах. І болей дамоў не вярнуўся. Жонка прапаўшага паставіла на ногі ўсю міліцыю, родных і знаёмых, але пошукі на працягу тыдня не прынеслі вынікаў. І раптам ён патэлефанаваў... з Ялты. Сказаў, што дабраўся добра, цягнікам, пры сабе мае грошы і дакументы, а вось вяртацца дамоў не збіраецца, прынамсі пакуль. Выйшлі на ўцекача работнікі міліцыі, яны ж і прымусілі яго патэлефанаваць дадому. Аператыўнікам матывамі свайго ўчынку жыхар Баранавічаў назваў сямейныя непаразуменні.

**Яна СВЕТАВА.**

### БОЧКАТЭРАПІЯ ПА-ВІЦЕБСКУ

Адны, як Дыяген, жылі ў бочках, іншыя, як японцы, у бочках мыліся, а вось віцебскія прыгажуні ў бочцы скідваюць лішнюю вагу і змагаюцца з цэлюлітам. Праўда, бочка гэтая не звычайная, а кедравая. Новая аздараўляльна-аднаўленчая працэдура некалькі дзён як з'явілася ў Віцебскім абласным клінічным скурна-венералагічным дыспансэры.



Загадчыца аддзялення рэабілітацыі Галіна СЕРЖАНАВА з пацыенткай Наталляй ДУБАВЕЦ.

**Аляксандр ХІТРОЎ, БЕЛТА.**
**Фота аўтара.**

Гучная справа

## ХАБАР ДЛЯ СТАРШЫНІ СЕЛЬСКАГА САВЕТА

**У дачыненні да 44-гадовай старшыні Аляхновіцкага сельскага Савета і сельскага выканкама Алены Шумскай заведзена крымінальная справа па ч. 3 арт. 430 Крымінальнага кодэкса — атрыманне хабару асобай, якая займае адказнае становішча.**

Як паведамілі ў прэс-службе Упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама, каля дзевяці месяцаў спатрэбілася аператыўнікам упраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі ў стратэгічных напрамках для таго, каб злавіць старшыню сельскага Савета з доказамі злачынства. Было ўстаноўлена, што затрыманая атрымлівала хабар у «электронным варыянце» — з дапамогай пластыкавых картак, якія перадавалі ёй разам з пін-кодам грамадзяне, зацікаўленыя ў вырашэнні пытанняў аб вылучэнні і афармленні зямельных участкаў, размешчаных на падведамаснай тэрыторыі. Адным з такіх пытанняў стала афармленне дакументаў аб выдзяленні зямельнага ўчастка для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома ў вёсцы Аляхновічы Маладзечанскага раёна для 38-гадовай жыхаркі сталіцы. Алена Шумская была затрымана каля банкамата, падчас спробы зняць апошнюю з трох тысяч долараў хабару. Чыноўніца знаходзіцца ў следчым ізалятары.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## КВАТАРАНТЫ

Жывая зямля



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Міёрскі раён.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЫБУХ У НАЗРАНІ: 20 ЗАГІНУЛЫХ, 138 ПАРАНЕНЫХ



**У сталіцы Інгушэціі горадзе Назрані ў панядзелак раніцай падарваны будынак, дзе размяшчаюцца ГУУС і РАУС. Паводле апошніх звестак МНС РФ, у выніку выбуху 20 чалавек загінулі, 138 атрымалі раненні, з іх 10 дзяцей.**

Прыкладна ў 9:00 па маскоўскім часе тэрарыст-смяротнік пратараніў вароты ГУУС замініраванай «Газэллю», заехаў у двор, дзе ішло пастраенне супрацоўнікаў міліцыі, і прывёў у дзеянне выбуховы механізм.

Паводле розных крыніц, магутнасць выбуху склала ад 200 кг да тоны ў трацілавым эквіваленце. У двары будынка ўтварылася варонка памерам 4 метры і глыбінёй 1,5-2 метры. За першым выбухам рушылі ўслед новыя — сталі выбухаць боепрыпасы ў збройевых пакоях.

**У сувязі з тэрактам у Назрані, які пацягнуў чалавечыя ахвяры, кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву, усяму расійскаму народу, родным і блізкім загінулых.**

### НЗ НА САЯНА-ШУШАНСКАЙ ГЭС: ДЗЯСЯТКІ АХВЯРАЎ



**Звесткі аб колькасці людзей, загінулых і зніклых пасля аварыі на Саяна-Шушанскай ГЭС, на працягу панядзелка паступалі розныя.**

Паводле інфармацыі ІТАР-ТАСС, колькасць загінулых у выніку НЗ у Хакасіі дасягнула васьмі чалавек. «Паводле папярэдніх звестак, загінула 8 працаўнікоў, якія абслугоўвалі машынную залу і турбіны, 10 чалавек паранена, 54 лічацца без весткі зніклымі», — паведаміў агенцтву афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта пры пракуратуры РФ Уладзімір Маркін.

Нагадаем, паводле інфармацыі следства, 17 жніўня на ГЭС, якая размешчана за 35 км ад Саянагорска, падчас рамонту аднаго з гідраагрэгатаў у машыннай зале адбыўся выбух масляного трансфарматара. Аднаўленчыя работы трох з дзесяці турбін зоймуць некалькі гадоў. Астатнія агрэгаты можна аднавіць больш хутка, лічаць спецыялісты. Па факце аварыі заведзена крымінальная справа.

### КІЕЎ ПАТРАБУЕ ТЛУМАЧЭННЯЎ АД МАСКВЫ

**МЗС Украіны даў даручэнне ўкраінскаму пасольству ў Расіі запатрабаваць афіцыйных тлумачэнняў ад Масквы ў сувязі з унесеным прэзідэнтам Мядзведзевым у пачатку мінулага тыдня праектам закона аб парадку ўжывання Узброеных Сілаў Расіі за межамі краіны. Акрамя таго, Украіна перадала Расіі 14-ю з пачатку года ноту пратэсту ў сувязі з забруджваннем Севастопальскай бухты Чарнаморскім флотам.**

Як паведаміў выканаўца абавязкаў першага намесніка міністра замежных спраў Украіны Юры Кастэнка, дыпламатычнае ведамства даручыла пасольству даведацца, як новы закон датычыцца «ўкраінскай зямлі, украінскага народа». Як растлумачыў дыпламат, бо на тэрыторыі Украіны знаходзіцца расійскі Чарнаморскі флот. Паводле слоў Кастэнкі, МЗС Украіны «з трывогай» успрыняло такі дакумент, паколькі выкарыстанне ваеннай сілы любой дзяржавы за яе межамі — «гэта няправільна і з'яўляецца агрэсіяй». Як падкрэсліў дыпламат, пакуль расійскі бок ніякіх тлумачэнняў не даў. Як паведамлялася раней, законапраект «Аб занясенні змяненняў у федэральны закон «Аб абароне» накіраваны на стварэнне прававога механізма, які забяспечыць магчымасць кіраўніку дзяржавы аператыўна выкарыстаць фарміраванні Узброеных Сілаў РФ за межамі тэрыторыі РФ.

### У ФРГ УЗМОЦНЯЦЬ ПАЛІЦЭЙСКІЯ ІНТЭРНЭТ-ПАТРУЛІ

**Нямецкі прафсаюз паліцэйскіх запатрабаваў ад уладаў вылучыць больш людзей для барацьбы са злачыннасцю ў інтэрнэце, паведамляе тэлеканал ARD. Паводле слоў старшыні прафсаюза Райнера Вента, інтэрнэт можа лічыцца «самым вялікім месцам злачынства ў свеце» і пакідаць яго без нагляду нельга.**

Прадстаўнікі паліцыі прапануюць дадаткова навучыць 2000 кібер-паліцэйскіх, якія будуць ажыццяўляць «узмоцненае патруляванне інтэрнэту». Для гэтых мэтаў, у прыватнасці, прапаноўваецца ўзмацніць узаемадзеянне паміж федэральнай крымінальнай паліцыяй і паліцыяй зямель.

Раней шэраг кансерватыўных палітыкаў ужо прапаноўвалі ўзмацніць кантроль над інтэрнэтам. Міністр па справах сям'і Урсула фон дэр Лаен, у прыватнасці, выступіла з ініцыятывай уводзінаў агульнапрызнанага кодэкса паводзінаў у Сеціве, які б, першым чынам, засцерагаў дзяцей і падлеткаў ад негатыўнага ўплыву.

Да патрабаванняў правых таксама далучыліся некаторыя прадстаўнікі «Зялёных». Прэс-сакратар фракцыі «Зялёных» па ўнутранай палітыцы Вольфганг Віланд прапанаваў нават не проста блакаваць доступ да грамадска-небяспечных сайтаў, а сціраць з усіх іх змесціва.

Гасцёўня

## Дзяніс КУР'ЯН: «МНЕ ЎЖО 25 ГАДОЎ, ТАМУ ТРЭБА РУХАЦЦА ХУТЧЭЙ!»



**На баку тэлевядучага Дзяніса Кур'яна — не толькі маладосць, энергічнасць і адданасць любімай справе. Ён мае здольнасць выконваць сваю работу так, каб ніхто не застаўся абыякавым. Адных раздражняе яго манера каментавання «Еўрабачання», другія паважліва нагадваюць, што нямногія ва ўзросце да 25 гадоў прызнаюцца лепшымі рэпарцёрамі ў сваёй краіне, трэція проста з цікавасцю глядзяць яго рэпартажы не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з розных куткоў свету...**

**Напрыклад, праект «Амерыканская мара», які рыхтуецца Агенцтвам тэленавінаў да новага тэлевізійнага сезона, выклікаў ажыятажную цікавасць і гарачыя баталіі ў інтэрнэце задоўга да выхаду ў эфір. Пра гэты праект і іншыя інтарэсы — тэлевізійныя і не толькі — я і распытала Дзяніса больш падрабязна.**

### Амерыка.... І ўвесь свет па алфавіце

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ РАЗВАГ: *«Амерыканская мара» — фільм аб жыцці беларусаў у ЗША. У дзвюх серыях зняліся больш як 20 герояў, сярод якіх і даволі вядомая — актрыса Наталля Рудакова, нашчадак Фані Каплан — радыёвядучы Сева Каплан, былы ўдзельнік «Песняроў» Аляксандр Растопчын і іншыя. У эфіры фільм з'явіцца на пачатку кастрычніка.*

**— Дзяніс, калі падсумаваць уражанні ад сустрэч з былымі землякамі-эмігрантамі, на твой погляд, у чым усё ж амерыканская мара большасці беларусаў? Едуць па доўгі рубель, ці найперш каб самарэалізавацца?**

— Калі яны з'язджаюць, гэта мара матэрыяльная, безумоўна. Калі ўжо жывуць там, нават калі ўсё складваецца не так, як марылі — стараюцца гэтага не паказаць. Мы, беларусы, якія жывуць у Беларусі, у сэнсе сваіх жыццёвых пошукаў, чаканняў больш адкрытыя, але затое менш мэтанакіраваныя. «Амерыканскія беларусы» значна больш практычныя, як і амерыканцы ўвогуле, яны думаюць рынкавымі катэгорыямі. Наш сярэднестатыстычны суайчыннік часта скардзіцца, разважаючы, што яму чагосьці не далі, не зрабілі — не далі кватэру, або далі не ў тым доме, або не з тымі суседзямі, і ўвогуле дзяржава не дапамагае, усё дрэнна... А «амерыканскі беларус» не шукае вінаватых у сваіх праблемах — магчыма, частка людзей папракае савецкую сістэму як частку свайго мінулага жыцця, але не лае цяперашні лад жыцця і тыя абставіны, у якіх жыве. Бо збылася ці не збылася амерыканская мара, а ходу назад ужо няма, трэба рухацца наперад. Вяртаюцца адзінкі — у нас у фільме будзе адзін такі герой, які вярнуўся на радзіму. Але многія, каму, верагодна, было б і лепш у сучаснай Беларусі, не згаджаюцца гэта прызнаць!

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.08.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 860,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 040,89 |
| 1 латвійскі лат | 5 766,71 |
| 1 літоўскі літ | 1 169,85 |
| 1 чэшская крона | 156,72 |
| 1 польскі злоты | 962,46 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 88,58 |
| 1 украінская грыўня | 355,72 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 32,2874 |
| UAH | 40,1585 |
| 1000 BYR | 11,3889 |
| EUR | 45,6350 |

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## ВЫЗВАЛЕНЫ АД ПАСАДЫ

Палкоўнік міліцыі Віктар Краснічэнка Указам № 423 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 17 жніўня вызвалены ад пасады начальніка УУС Брэсцкага аблвыканкама і залічаны ў распараджэнне міністра ўнутраных спраў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Антыкрызісная эканоміка**

## Шукаць новыя рынкі збыту

**У Брэсцкім аблвыканкаме прайшла спецыяльная нарада дырэктарскага корпусу, прысвечаная праблеме затаваранасці складоў і пошуку новых рынкаў збыту. Напачатку было адзначана: складскія запасы прадпрыемстваў вобласці цяпер складаюць 73 працэнты месячнага аб'ёму вытворчасці пры вызначаным заданні — 58 працэнтаў. На некаторых жа прадпрыемствах мясамалочнай, плодаагародніннай галін, мясцовай прамысловасці гэты паказчык даходзіць да 100, і нават да 150 працэнтаў.**

Амаль усе выступоўцы былі аднадушныя ў тым, што Расія — не адзінае святло ў акенцы для нашых маркетолагаў, хоць і гэты рынак ні ў якім разе нельга страчваць зусім.

Канстанцін Свірыд, дырэктар брэсцкага канцэрна «Мясамалпрам», распавёў, што прадпрыемствы канцэрна працуюць над пашырэннем асартыменту сыроў. Сёння гэта менавіта той прадукт, экспарт якога прыносіць найбольшы прыбытак. Самыя прывабныя цэны сусветнага рынку на гэту прадукцыю складваюцца ў кастрычніку-лістападзе. Вось вытворцы стараюцца прытрымаць прадукцыю да восені. Малочнікі рэгіёна цяпер вядуць перамовы наконт паставак сухога малака ў Алжыр, Індыю, Сінгапур. А сметанковае масла ўжо адгружаецца ва Украіну і ў Малдову.

Аляксандр Саўчыц, генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт» расказаў, што за апошні час прадпрыемства ў 3,5 раза павялічыла свой экспарт у Азербайджан. Расце попыт на малочную прадукцыю ў Казахстане, першыя партыі сыроў і тварагу адгружаны ў Арабскія Эміраты, пробная партыя сухога малака накіравана ў Кітай.

Уладзімір Мікіціч, дырэктар ААТ «Пружанскі малочны камбінат», паведаміў аб праблемах невялікіх прадпрыемстваў. На складах пружанскага камбіната запасы гатовай прадукцыі перавышаюць норму на 325 тон. Гэта звязана з вялікім перапынкам у пастаўках на расійскі рынак. Сёння пастаўкі аднаўленыя. Тут працуюць з прыцягненнем спецыялістаў з Германіі і Аўстрыі над пашырэннем вытворчасці і паляпшэннем якасці прадукцыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Гродзенскія бутэлькі для грузінскага віна

**Гродзенскі шклозавод накіраваў у Грузію першую партыю віннай тары. А мінеральную ваду прадпрыемства «Аквадзіў» у гродзенскіх бутэльках мяркуецца пастаўляць у Азербайджан.**

Асноўным экспартным рынкам для шклозавода па-ранейшаму з'яўляецца Расія. Заключаны і дагаворы на пастаўку шкла і шклатары ў краіны Прыбалтыкі, Малдову, Германію, Чэхію. Да таго ж, апошнім часам на прадпрыемстве наладзілі вытворчасць дзесяці новых тыпаў бутэлек, якія раней у Беларусь імпартаваліся.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ...КЛАНДАЙК ДЛЯ ЭТНОГРАФА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Увогуле цэны на некаторыя рэчы ў параўнанні з мінулым фестывалем падняліся шматкроць. Напрыклад, на саламяныя капелюшы з 10 да 35—40 тысяч. Зрэшты, гэта сведчыць пра тое, што ёсць попыт, што вырабы народных майстроў выраслі ў цане. Парадавала, што зноў тут былі, хай сабе і не танныя, але ўнікальныя бандарныя вырабы. Прывёз свае творы лозапляцельшчык Сяргей Міхальчук з вёскі Гнеўчыцы. У яго можна было купіць вялікі паднос-фруктоўніцу за 35 тысяч, крэсла — за 120, стол — за 200, а падстаўку пад гарачы кубак — за тры. Здаецца, ён прадаў амаль усё. Многім раздаў свае адрасы і атрымаў некалькі прапаноў і замоваў. Але падобных яму майстроў усё ж такі не хапала. Хоць, напэўна, іх нямала ў Іванаўскім раёне.

Аднак фестываль гэты перш за ўсё кулінарны. І ежы тут усякай сапраўды было шмат. Літаральна на кожным квадратным метры можна было прадэгуставаць не толькі мотальскія, але і з іншых вёсак традыцыйныя і непаўторныя стравы, запечаныя ў гаршках кашы, бульбу, дранікі, адмысловыя кампоты, мёд, марынаваныя гуркі і капусту, юшку, якую варылі прама на плошчы на вогнішчы... Ды шмат чаго, усяго не пералічыш.

Добрай ідэяй стаў сёлета конкурс вясельных каравая̆ў, хоць блізка разгледзець гэтыя сапраўдныя творы мастацтва, не кажучы ўжо пра тое, каб іх пакаштаваць, было праблематычна. Надзея Палто стала лепшай «каравайніцай». У намінацыі «бабульчына кухня» перамагла Марыя Шыкалай, лепшым пасечнікам быў прызнаны Іван Кульбеда, а галоўнай стравай фестывалю былі названы дранікі Ніны Райкевіч. Шкада, што конкурсы гэтыя прайшлі амаль незаўважна для гасцей. Не хапала нейкага элементу спаборніцтва, адчування інтрыгі.

Сёлета на фестывалі адбыліся дзве важныя падзеі. Прэзентацыя кнігі «Народная кухня Маталян», якую зрабілі па выніках этнаграфічнай экспедыцыі Тадэвуш Навагродскі, Ірына Алюніна і Сцяпан Захаркевіч. І ўдзел у фестывалі міжнародных экспертаў у галіне традыцыйнай кухні, сярод якіх быў і каардынатар Сеткі рэгіянальнай кулінарнай спадчыны Еўропы Ян Хансан.



Што датычыцца кнігі, то яна сапраўды ўнікальная, бо гэта не проста рэцэпты альбо навуковая справаздача. Гэта — збор жывых, з захаваннем асаблівасцяў маталянскай гаворкі, аповедаў пра тое, як і што тут елі, гатавалі, падавалі на стол, захоўвалі... І захоўваюць, гатуюць дагэтуль.

— Моталь — гэта клангдайк для этнографаў, — падзяліўся сваімі ўражаннямі адзін з аўтараў кнігі Тадэвуш Навагродскі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гістарычных навук факультэта БДУ. — Тут усё жывое — мова, традыцыі, абрады. Мы жылі тут разам са студэнтамі тры тыдні. На трэці дзень на мотальскай мове сталі размаўляць кіраўнікі экспедыцыі, а на пяты — і самі студэнты. І цяпер мы плануем прыехаць з экспедыцыяй сюды зноў, бо шмат яшчэ чаго можна даведацца. Дарэчы, праз кухню можна даведацца пра гісторыю таго альбо іншага народа, рэгіёну, ды і ўсяго чалавецтва.

Калі скарочана ахарактарызаваць, што такое Моталь і матыляне, кажуць аўтары кнігі, то гэта гасціннасць, заможнасць і дабрыня. Ніводны чалавек не адмовіў удзельнікам экспедыцыі, заўсёды для іх быў накрыты стол, а на развітанне падораны старадаўнія рэчы, у тым ліку ўнікальныя, якія значна папоўнілі экспазіцыю ўніверсітэцкага музея.

Што датычыцца мотальскай кухні, яна вельмі самабытная і сапраўды традыцыйная. Пра гэта сведчыць і тое, што ў новых дамах маладыя гаспадары не шкадуюць месца і робяць печы, у якіх гатуюць ежу («бо на газе так не зробіш»).

— Тое, што я тут убачыў і пакаштаваў — проста цуд! — сказаў Ян Хансан (з ім былі згодныя і іншыя эксперты). — Галоўнае, каб вы гэта захавалі. Бо гэта мае надзвычай вялікія перспектывы для развіцця ўязнога турызму. Многія еўрапейцы проста звар'яцелі на кулінарных турах. Таму такую папулярнасць маюць сырныя, піўныя, вінныя туры, фестывалі асобных страў і шоу пэўных прадуктаў.

Ян Хансан прапанаваў Іванаўскаму раёну ўступіць у Сетку рэгіянальнай кулінарнай спадчыны Еўропы, членства ў якой дазваляць накіраваць сюды паток турыстаў са Швецыі, Германіі, Іспаніі, Італіі і іншых краін заходняй Еўропы.



Безумоўна, фестываль удаўся. Яго арганізатарамі і фундатарамі выступілі Іванаўскі выканаўчы камітэт, БГА «Адпачынак у вёсцы», Пасольства ЗША ў Беларусі, Праграма падтрымкі Беларусі ўладамі Германіі, Асацыяцыя рэгіянальнай кулінарнай спадчыны Еўропы, Установа «Новая Еўразія», Брэсцкі грамадскі савет па аграэкатурызму.

Цяжка ўявіць, каб у Моталі нешта не ўдалося. Людзі тут працавітыя, вельмі творчыя і прадпрымальныя. Яны любяць свой край, ганарацца ім, і гэта адчуваецца ва ўсім. Нездарма абедзве вясковыя школы ў Моталі перапоўненыя, а ў адной дзеці займаюцца ў дзве змены. Тут усё вышэйшай якасці. Таму сама прысутнасць у Моталі абагачае, дае добры зарад і паляпшае настрой.

Што ўжо і казаць пра самую цёплую частку фестывалю — размяшчэнне гасцей у хатах маталян. Проста адчуеш, што ў адной з самых дзіўных і прыгожых мясцін планеты ў цябе з'явіўся дом, родныя людзі, узгадваць якіх ты будзеш з любоўю і падзякай, і чакаць з імі сустрэчы з радасцю...

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, фота аўтара.**

*Моталь.*

## МЕСТАЧКОВЫ «ГАНГСТАР»

**Надвячоркам у пружанскую краму, якая размешчана на самай ускраіне горада, уварваўся невядомы і стаў пагражаць прадметам, падобным на пісталет.**

Такім чынам ён забраў выручку ў суме адзін мільён 718 тысяч рублёў і бутэльку гарэлкі. Гэтага рабаўніку падалося мала і ён адабраў яшчэ 100 тысяч рублёў у выпадковага пакупніка. Па гарачых слядах затрыманы непрацуючы жыхар Брэста 1984 года нараджэння.

**Яна СВЕТАВА.**

# «НОВАЕ ЖЫЛЛЁ? РЭАЛЬНА!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Напрыклад, у Бараўлянах прыватныя фінансавыя структуры наладзілі будаўніцтва цэлых жылых комплексаў сучаснага жылля. Асобныя кватэры на крайніх паверхах тых дамоў прапануюцца сёння кліентам па кошце, значна ніжэйшым за 1000 долараў за квадратны метр.

Паменшыўся кошт долевага будаўніцтва і ў абласных цэнтрах. Квадратны метр «далёўкі» ў такіх буйных гарадах складае ўсяго 700—800 долараў (было 1200—1400).

### Рынак патрабуе кватэры невялікіх плошчаў

У свой час кіраўніцтвам нашай краіны была ўзнята праблема пустых кватэр у камерцыйных дамах. Гэтая праблема часткова застаецца нявырашанай і сёння, калі ў жылых новых дамах на працягу вялікага часу застаецца шмат незаселеных кватэр з вялікімі плошчамі. Сёння амаль ніхто не хоча купляць двухпакаёвую кватэру агульнай плошчай каля 70—76 квадратных метраў або трохпакаёўку плошчай да 100 жылых «квадратаў». Такія кватэры па кішэні толькі сапраўды багатым людзям...

***Камерцыйныя структуры пачалі будаваць маленькія кватэры эканом-класа, дзе плошча аднапакаёвак складае 40—42 кв. метра, а двухпакаёвак — 52—54 «квадраты».***

— Камерцыйныя структуры першымі заўважылі новыя тэндэнцыі актыўнага попыту на будаўніцтва жылля менавіта невялікіх плошчаў, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ**. — Наступствы сусветнага фінансавага крызісу прымушаюць гараджан будаваць сабе выключна рацыянальнае і больш таннае жыллё. Сёння ў дамах долевага будаўніцтва такой катэгорыі грамадзян прапануюцца цэлыя наборы секцый жыллёвых памяшканняў, дзе плошча аднапакаёвых кватэр абмежавана 40—42 квадратнымі метрамі, а двухпакаёвак — складае да 52—54 кв. метраў.

### Чаргавікоў «выратоўваюць» ільготныя крэдыты

Жыллёвае пытанне закранула непасрэдна і аўтара гэтага матэрыяла. Рэч у тым, што летась у сакавіку я стаў шматдзетным татам, калі пасля дзвюх дзяўчынак у мяне нарадзіўся сын. Шчыра кажучы, я наіўна тады спадзяваўся, што пасля трох месяцаў пасля пастаноўкі на асобны жыллёвы ўлік па лініі шматдзетных сем'яў нам прапануюць будаваць жыллё, але... У Мінску шматдзетных сем'яў стала ўжо даволі шмат і нават іх асобная чарга рухалася марудна. Мая ўласная жыллёвая праблема скранулася з мёртвай кропкі сёлета ў чэрвені, калі кіраўніком нашай дзяржавы быў падпісаны ўказ № 301, якім унесены змяненні і дапаўненні ва Указ № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў».

У адпаведнасці з нормамі новага ўказа шматдзетныя сем'і павінны цяпер уключацца ў арганізацыю забудоўшчыкаў на працягу года з дня падачы імі адпаведнай заявы. А ўжо праз тыдзень раённая адміністрацыя прапанавала мне будавацца. Больш за тое, новы ўказ вызначаў, што цяпер стаўка па льготных крэдытах на жыллёвае будаўніцтва зніжаецца з 3 да 1 працэнта гадавых. Камусьці можа здацца, што мінус 2 працэнты гадавых істотна не паўплывае на фінансавае становішча крэдытораў. А вось і не. Крэдытныя выплаты пасля гэтага аўтаматычна зменшыліся адразу амаль на 20 працэнтаў. Гэта даволі добрая навіна, але... Калі б маёй шматдзетнай сям'і прапанавалі будавацца мінулай восенню, то квадратны метр тады мне б абышоўся па кошце 1,1—1,2 млн рублёў. А вось сёння мая будучая кватэра будуецца ўжо па іншым цэнніку, дзе кошт квадратнага метра складае, паводле папярэдніх падлікаў, у межах 1,7—1,8 млн рублёў.

Для пэўнай колькасці «чаргавікоў» і шматдзетных сем'яў існуе яшчэ некалькі істотных момантаў. Ільготны крэдыт даецца толькі на пэўныя квадратныя метры нарміраванай плошчы жылля. А калі ў чаргавіка, у тым ліку шматдзетнай сям'і, ужо ёсць невялікая ўласная кватэра, то плошча яе ўлічваецца і адмінусоўваецца ад нарміраванай плошчы, якая падпадае пад ільготны крэдыт. У гэтым выпадку асобам з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў магчыма ўзяць дадатковы крэдыт ужо пад 17 працэнтаў гадавых. Шматдзетным сем'ям у гэтым выпадку «Беларусбанк» прапануе лепшыя ўмовы крэдытавання. На лішнія метры шматдзетным банк прапануе крэдыт, дзе працэнтная стаўка складае стаўку рэфінансавання плюс 1 працэнт. Нам, шматдзетным бацькам, цяпер застаецца толькі марыць, каб гэтая стаўка рэфінансавання (сёння яна складае 14 працэнтаў) не павялічвалася. А яшчэ, каб заробкі нашы дазвалялі і будавацца і жыць бязбедна... Між іншым, дзяржава нам у гэтым моцна дапамагае.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Спорт-тайм**

## СЯМЁРКА ЗОЛАТАМ

**Беларускія спартсмены выйгралі сем залатых медалёў на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ, які прайшоў у Канадзе.**



16 жніўня экіпаж каналістаў у складзе братоў Андрэя і Аляксандра Багдановічаў, Дзмітрыя Рабчанкі і Аляксандра Валчэцкага стаў лепшым на 200 метраў, пераадолеўшы дыстанцыю за 34,147 сек. і апярэдзіўшы расійскую каманду на 0,352 сек. На двухсотцы перамагла і байдарка-чацвёрка (Раман Петрушэнка, Вадзім Махнёў, Аляксей Абалмасаў і Артур Літвінчук), вынік якой — 30,412 сек. У той жа дзень беларускія весляры выйгралі яшчэ тры «золаты». Двойчы перамагла байдарка-двойка Петрушэнкі і Махнёва **(на фота)** — на 500 і 200 метраў. А ў спаборніцтвах каноэ-адзіночак на 500 метраў пераможцам стаў Дзяніс Гаража. Напярэдадні, 15 жніўня, стаў паспяховым для нашых чацвёрак на дыстанцыях 1000 метраў. «Золата» ў актыве каналістаў Дзяніса Гаража, Дзмітрыя Рабчанкі, Дзмітрыя Вайцішкіна і Аляксандра Валчэцкага, а таксама ўсё тых жа байдарачнікаў Петрушэнкі, Махнёва, Абалмасава і Літвінчука.

Беларуская каманда заняла 2-е месца ў медальным заліку адразу пасля зборнай Германіі, у якой таксама 7 залатых медалёў, 8 сярэбраных і 3 бронзавыя.

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў беларускіх спартсменаў з залатымі медалямі і пажадаў ім новых высокіх дасягненняў.***

## І ЗНОЎ У АДРЫЎ

Чэмпіён Беларусі барысаўскі БАТЭ павялічыў адрыў ад праследавальнікаў да 12 ачкоў, абгуляўшы дома з лікам 1:0 ФК «Мінск». Дзякуючы гасцявой перамозе над магілёўскім «Дняпром» з лікам 2:1 на другое месца выйшаў гродзенскі «Нёман». Вынікі астатніх матчаў 15 тура: «Дынама» (Мн) — «Смаргонь» 1:1; «Тарпеда» — «Граніт» 1:3; «Нафтан» — МТЗ-РІПА 2:1; «Шахцёр» — «Дынама» (Бр) 1:1; «Віцебск» — «Гомель» 1:0.

Становішча камандаў у чэмпіянаце: БАТЭ — 37 ачкоў, «Нёман» — 25, «Нафтан» — 25, «Тарпеда» — 25, «Дынама» (Мн) — 24, «Днепр» — 23, «Шахцёр» — 22, «Дынама» (Бр) — 21, «Мінск» — 19, «Гомель» — 18, «Віцебск» — 16, «Граніт» — 16, МТЗ-РІПА — 15, «Смаргонь» — 7 ачкоў.

## БЕРЛІН БЕЗМЕДАЛЁВЫ

**Віцэ-чэмпіёнка пекінскай Алімпіяды-2008 беларуска Наталля Міхневіч з вынікам 19,66 метра 16 жніўня заняла толькі 4-е месца ў штурханні ядра на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы ў Берліне.**

Сярод мужчын у гэтым жа відзе праграмы Павел Лыжын, устанавіўшы асабісты рэкорд (20,98), заняў 6-е месца, а чэмпіён свету-2003 і бронзавы прызёр Алімпіяды-2008 Андрэй Міхневіч апынуўся адразу за суайчыннікам з вынікам 20,74. У кіданні кап'я сярод жанчын Марына Новік не здолела пераадолець кваліфікацыйны бар'ер, у сваёй лепшай спробе паказаўшы 56,44 метра, у спартыўнай хадзе на 20 кіламетраў Сняжана Юрчанка паказала 15-ы вынік, у трайным скачку Дзмітрый Дэцук паказаў усяго 16,58, таксама не пераадолеўшы кваліфікацыйны бар'ер.

## РЭКОРДНЫ БОЛТ



Там жа ў Берліне на закуску арганізатары пакінулі гучна анансаванае відовішча: прадстаўнік Ямайкі Усэйн Болт супраць амерыканца Тайсана Гэя ў фінале стаметроўкі. У выніку гледачы ўбачылі фенаменальны забег, у якім Болт зноў абнавіў свой сусветны рэкорд, устанавіўшы яго на адзнацы 9,58, а Гэй здавальваўся новым рэкордам ЗША — 9,71.

## МІРНЫ ПРАЙГРАЎ БЫЛОМУ ПАРТНЁРУ

У Манрэалі завяршыўся міжнародны турнір з прызавым фондам у 3 млн долараў. У фінале парнага разраду беларус Максім Мірны і ізраільцянін Андзі Рам прайгралі індыйска-багамскаму дуэту Махеш Бхупаці — Марк Ноулз (4:6, 3:6).

## ЖАНОЧЫ БОКС СТАНЕ АЛІМПІЙСКІМ

У Алімпійскіх гульнях у Лондане ў 2012 годзе змогуць удзельнічаць жанчыны-баксёры — такое рашэнне прыняло кіраўніцтва Міжнароднага алімпійскага камітэта. Жанчыны будуць спаборнічаць у трох вагавых катэгорыях, пры гэтым будуць адменены спаборніцтвы ў адной вагавай катэгорыі ў мужчын. Алімпійскім відам спорту ў 2016 годзе, як чакаецца, стане і гольф — пасля 112-гадовага перапынку.

# УСЯ СПРАВА Ў СЭРЦЫ?

**Ці сардэчны прыступ прывёў да ДТЗ з лятальным вынікам — могуць адказаць толькі медыкі.**

Учора ў сем гадзін раніцы на закругленні дарогі «Орша—Копысь» кіроўца 1971 года нараджэння на «Фальксвагене-Джэта» не справіўся з кіраваннем і сутыкнуўся з прыдарожным дрэвам, — паведаміла **начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама Алеся СЯРОГІНА**. — У выніку атрыманых траўмаў мужчына памёр. Цела кіроўцы адпраўлена на экспертызу. У яго мог здарыцца сардэчны прыступ, але гэта толькі здагадкі. Сапраўдную прычыну ДТЗ можна будзе назваць толькі пасля заключэння экспертаў.

Як паведамілі ў Дзяржаўтаінспекцыі МУС, летам павялічваецца колькасць ДТЗ па прычыне дрэннага самаадчування кіроўцаў, у тым ліку і са смяротным вынікам. Але, паводле слоў Алесі Сярогінай, на Віцебшчыне сёлета такія ДТЗ адзінкавыя. «Асноўная наша бяда — п'яныя кіроўцы і «шумахеры».

**Надзея ДРЫЛА.**

Выпіска з рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў

| Від інфармацыйнай прадукцыі | Назва, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі | Назва суда, які вынес рашэнне, і дата ўваходжання ў сілу рашэння суда |
|---|---|---|
| Кніжныя выданні | «Приговор убивающим Россию», Барыс Міронаў, Мінск, ЗАТ «Праваслаўная ініцыятыва», 2005 г. | Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 08.07.2009 г. |

**Абзац**

◢ **У КСУП «Маложынскі» Брагінскага раёна па недаглядзе пастухоў у ноч з 14 на 15 жніўня ў лесе згубіліся каля 200 кароў. У «самаволку» каровы пайшлі, пераадолеўшы агароджы летняга лагера. Пошукі, у якіх былі задзейнічаныя працаўнікі гаспадаркі, мясцовыя жыхары і міліцыя, дазволілі вярнуць асноўнае пагалоўе. Лёс яшчэ 19 жывёл невядомы. Тэрыторыя гаспадаркі суседнічае з шырокім лясным масівам у зоне радыеактыўнага забруджвання, дзе ніхто не жыве.**

◢ Трагедыяй завяршылася вяселле ў вёсцы Кодзеўцы Гродзенскага раёна. Паміж гасцямі ўзнікла сварка і аднаго з яе ўдзельнікаў выгналі. «Пакрыўджаны» падпільнаваў «крыўдніка», калі той вяртаўся дадому, і пачаў збіваць. Прычыненыя траўмы сталі смяротнымі — пацярпелы сканаў на месцы. Спагнаўшы злосць, 36-гадовы мужчына, дарэчы, раней неаднаразова судзімы, вярнуўся дадому і спакойна лёг спаць.

◢ **Супрацоўнікі міліцыі затрымалі жыхара Барысаўскага раёна па падазрэнні ў забойстве пенсіянеркі, няпоўнагадовая ўнучка якой была яго нявестай. «Папярэдне ўстаноўлена, што сварка адбылася ў хаце забітай падчас распівання спіртных напояў. У памяшканні знаходзіліся пенсіянерка, яе 17-гадовая ўнучка і падазроны. Падчас сваркі жанчына была задушаная, яе ўнучка з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і страсеннем мозгу дастаўленая ў бальніцу», расказалі ва УУС. Яны таксама паведамілі, што ўнучка забітай была цяжарная і збегла з бальніцы.**

**Поўны абзац**

◢ У горадзе Запарожжа, адміністрацыйным цэнтры Запарожскай вобласці Украіны, будзе пабудаваны «Мост да цешчы і свякрухі». Архітэктурная кампазіцыя будзе выкананая ў выглядзе альтанкі пасярод возера ў парку Вазнясенаўскі, да якой вядзе каваны масток. Будынак будзе пабудаваны да Дня горада, які адзначаецца 14 кастрычніка. Арыгінальную назву прапанаваў мэр горада Яўген Карташоў, які мяркуе, што альтанка на возеры стане ўпадабаным месцам маладых і закаханых парачак, якія змогуць там «аддаць даніну кахання і павагі сваім маці».



◢ **У Кнігу рэкордаў Гінэса занесена новае дасягненне — гіганцкі кекс вагой больш за 555 кілаграмаў. Яго спяклі і прадэманстравалі публіцы кандытары штата Нью-Гэмпшыр (Англія). Для прыгатавання велізарнага кекса зспатрэбілася 800 яек і па 90 кілаграмаў мукі і цукру.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*


## Мирский поселковый исполнительный комитет
## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**1. На право заключения договора аренды на 5 лет для строительства и обслуживания торговых павильонов по адресу: Гродненская обл., Кореличский район, г.п. Мир, ул. Красноармейская.**

**Лот 1 (У-1)** — площадь участка — 0,0047 га с кадастровым номером 423355700001001012, начальная цена — 86 152 белорусских рубля, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,0047 га, охранная зона напряжением до 1000 Вольт на площади 0,0020 га.

**Лот 2 (У-2)** — площадь участка — 0,0038 га с кадастровым номером 423355700001001016, начальная цена — 69 656 белорусских рублей, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,0038 га, охранная зона напряжением до 1000 Вольт на площади 0,0010 га.

**Лот 3 (У-3)** — площадь участка — 0,0049 га с кадастровым номером 423355700001001015, начальная цена — 89 919 белорусских рублей, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,0049 га, охранная зона напряжением до 1000 Вольт на площади 0,0004 га.

**Лот 4 (У-4)** — площадь участка — 0,0048 га с кадастровым номером 423355700001001014, начальная цена — 87 984 белорусских рубля, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,0048 га, охранная зона напряжением до 1000 Вольт на площади 0,0002 га.

**Лот 5 (У-5)** — площадь участка — 0,0038 га с кадастровым номером 423355700001001013, начальная цена — 69 656 белорусских рублей, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,0038 га.

**Лот 6 (У-6)** — площадь участка — 0,0048 га с кадастровым номером 423355700001001011, начальная цена — 87 984 белорусских рубля, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,0048 га.

Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 687 642 белорусских рубля и затраты на объявление в СМИ.

**2. По продаже земельного участка в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Гродненская обл., Кореличский район, Мирский поссовет, д. Криничное.**

**Лот 7 (У-7)** — площадь участка — 0,2213 га с кадастровым номером 423375703601000044, начальная цена — 63 425 белорусских рублей, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,2213 га.

**Лот 8 (У-8)** — площадь участка — 0,2210 га с кадастровым номером 423375703601000043, начальная цена — 63 425 белорусских рублей, участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы на площади 0,2210 га.

Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 556 181 белорусский рубль и затраты на объявление в СМИ.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3600518070015 в филиале 411 АСБ «Беларусбанк», код 695, УНП 500008202. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **18.09.2009 года в 15.00** по адресу: Кореличский район, Гродненская область, г.п. Мир, ул. Первомайская, д. 2 (поссовет).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения до **17.30 14 сентября 2009 года** по адресу: г.п. Мир, ул. Первомайская, д. 2 (поссовет).

**Контактные телефоны: 8(01596) 23 1 93, 23 3 75, 23 1 35.**


# «МНЕ ЎЖО 25 ГАДОЎ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Дарэчы, а ў цябе не было свайго аналагу «амерыканскай мары»? Мы ўжо прызвычаіліся, што паспяховыя людзі пакідаюць Беларусь і рэалізуюцца за мяжой...**

— У мяне не было такой мары, бо я дастаткова шчыльна асеў тут. Я бачу вельмі многа перспектыў для самарэалізацыі ў розных кірунках, бо не займаюся толькі адной справай. На ўвазе маецца не толькі тэлебачанне, упэўнены, што магу прынесці нават большую карысць у іншых сферах айчыннай эканомікі. А калі б рухаўся толькі ў адным кірунку — скажам, працаваў тэлевядучым і не бачыў сябе ў іншай галіне, — то, натуральна, рана ці позна ўпёрся б у столь. Напэўна, гэта аб'ектыўна, бо краіна ў нас невялікая, бо тэлебачанне толькі пачынае зараджацца, і дасягнуць прафесійных вяршыняў пры жаданні можна даволі хутка. Я што маю на ўвазе: на амерыканскім тэлебачанні, каб стаць вядучым навінаў, могуць спатрэбіцца дзесяцігоддзі. А ў нас як звычайна адбываецца? Правялі кастынг, знайшлі новых вядучых. Я катэгарычна супраць кастынгаў, цярпець іх не магу! Прабачце, акцёры абласных тэатраў будуць расказваць мне пра актуальныя навіны ў краіне?! Не разумею і не прымаю гэтага, бо, паводле амерыканскіх стандартаў тэлебачання, расказваць навіны павінен чалавек, які дзесяць гадоў быў асістэнтам карэспандэнта, потым пяць гадоў рабіў стэнд-апы... Памятаеш фільм «Брус Усемагутны»? Гэта камедыя, але кар'ерная лесвіца там паказаная больш-менш выразна. Пасада вядучага там — вяршыня лесвіцы. Дзякаваць Богу, наш канал не набірае вядучых на «народных» кастынгах. У кадры павінен сядзець журналіст, які піша сабе тэксты сам, — толькі тады ён пераканаўчы... Вяртаючыся да нашай тэмы — я вырашыў, каб не ўпірацца ў столь і не ведаць, што рабіць далей, пайсці іншым шляхам: «закінуў шчупальцы» ў розныя галіны тэлебачання. Вось і ўвесь сакрэт.

**— Гэтым і выклікана твая ўсюдыіснасць — ад эканомікі (праграма «Сфера інтарэсаў») да аўтамабіляў («Свет матораў»), ад рэпарцёрскай работы да «Еўрабачання»?**

— Яна выклікана прафесійнымі прычынамі — запрашаюць у розныя праекты, лічаць, што я дастойны гэта рабіць. Калі мяне задавальваюць умовы таго ці іншага праекта — калі ласка, працуем.

**— Можа, ёсць жаданне закрануць новыя сферы — скажам, кулінарнае шоу ці забаўляльную праграму?**

— Чагосьці канкрэтнага, што хацелася б стварыць, няма. Лічу сябе чалавекам, які няблага вывучыў беларускае тэлебачанне ў плане яго стандартаў, вытворчасці і гэтак далей, таму я гатовы працаваць абсалютна ў любой перадачы, у любой ролі.

### «Еўрабачанне» ў сабе

***Інфармацыя для развагі:** апошнія некалькі гадоў Дзяніс Кур'ян выступае ў ролі каментатара песеннага конкурсу «Еўрабачанне» — а ў перспектыве мы ўбачым яго і ў ролі вядучага дзіцячага «Еўрабачання-2010». Пакуль жа Дзяніс вывучае тэму глыбей, робіць праект «Дзеці Еўрабачання» пра беларускіх канкурсантаў. 29 і 30 жніўня выйдуць у эфір дзве новыя серыі — пра пераможцу 2005 года Ксенію Сітнік і «сярэбранага прызёра» 2006 года Андрэя Кунца.*

**— Па змоўчанні лічыцца, што ўсе юныя артысты мараць, калі вырастуць, стаць «зоркамі»...**

— На жаль, сапраўды так. Нават бацькі з дзяцінства падштурхоўваюць у гэтым кірунку. І яны ўсе абсалютна ўпэўненыя, што, раз былі паспяховымі дзецьмі, гэтак сама стануць паспяховымі дарослымі. Аднак мне здаецца, зыходзячы з жыццёвай практычнасці, што нельга складваць усе яйкі ў адзін кошык, і мець за спінай толькі творчасць. Бо сёння цябе павялі за руку ў канцэрты, у эстрадныя студыі, у той ці іншы праект — а заўтра, выходзячы ў свабоднае плаванне, ты разумееш — больш ніхто за руку не павядзе. І гэта ўжо душэўная траўма, і мы памятаем многа прыкладаў, калі таленавітыя дзеці потым не маглі рэалізавацца ў жыцці — можна перагледзець архіўныя запісы беларускага тэлебачання 80-х гадоў і задацца пытаннем, дзе ўсе гэтыя дзеці, або прыгадаць, як склаўся лёс у многіх «дзяцей кіно»... Таму, лічу, вельмі важна гэтым дзецям не настройвацца на тое, што ў цябе ўжо ўсё ёсць і цябе будуць любіць усё жыццё.

**— Таму ты і павёў Ксюшу Сітнік, якая больш за ўсё на свеце баіцца змей, у тэрарыум — каб паказаць, што далей будзе цяжэй?**

— Але ж, добрая ідэя — і Андрэя Кунца з гэтай жа мэтай парашутам з 10 тысяч метраў скінулі. *(Смяецца).* Насамрэч мы проста знайшлі такі творчы ход, дамовіліся з імі: яны ўжо дарослыя, таму павінны змагацца са сваімі дзіцячымі страхамі, каб не браць іх у дарослае жыццё. Каб паспрабаваць пераадолець гэтыя страхі, мы і «скармілі» Ксюшу рэптыліям, а Андрэй Кунец разам з аўтарам фільма Юрам Таболіным скочыў з парашутам.

### Мары — збываюцца

***Інфармацыя для развагі:** спецыяльны карэспандэнт АТН Дзяніс Кур'ян мае прэстыжную адукацыю — Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце, магістр бізнэс-адміністравання. На прафесійную рэалізацыю таксама грэх скардзіцца: адзіны беларускі тэлежурналіст, акрэдытаваны ў ЗША, уладальнік прэміі «Тэлевяршыня-2006» як лепшы рэпарцёр. Але ён застаецца сабой незадаволены, імкнучыся ці то паспець ва ўсе куткі зямнога шара, ці то асягнуць неабсяжнае...*

**— У тваёй анкеце на сайце Белтэлерадыёкампаніі пазначана крэда: «Бойцеся сваіх мараў — яны збываюцца». Але збоку здаецца, што гэта проста поза, і ўсё атрымліваецца, за што ні возьмешся.**

— Зусім не. Мараў, якія не збыліся, велізарная колькасць. Па вялікім рахунку, яшчэ нічога не збылося. Акрамя таго, што я шчаслівы чалавек — у маіх родных і блізкіх усё добра, усё ў парадку са здароўем...

**— А ў кар'еры хіба няўдачлівы?**

— Імкнуцца выключна да прызнання лепшым рэпарцёрам? Не, гэта смешна. Я шчыра накіраваны на тое, каб прынесці карысць айчыннаму тэлебачанню, вельмі шчаслівы, што ў мяне ёсць усе магчымасці для гэтага, што Бог дае сілы і здароўе. Але абсалютна не лічу сябе рэалізаваным. Бачу перспектывы на будучыню, аднак разумею, што мне ўжо 25 гадоў, таму трэба рухацца хутчэй, каб усё паспець.

**— Ну, хоць нядаўняе 25-годдзе ўдалося адзначыць, як хацелася, ці сустрэў на працы?**

— Удалося — разам з каханай жонкай...

**— А кажаш, мары не збываюцца!**

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з асабістага архіва Дзяніса КУР'ЯНА.**

## ЖУРНАЛІСТАЎ НТБ З БЕЛАРУСІ НІХТО НЕ ВЫДВАРАЎ

Ніякага рашэння аб выдварэнні здымачнай групы тэлеканала НТБ з Беларусі ніхто не прымаў. Аб гэтым заявілі ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі. У той жа час у міністэрстве адзначылі, што не выклікае ніякага сумнення факт парушэння прадстаўнікамі гэтага тэлеканала існуючых правілаў работы замежных журналістаў на тэрыторыі Беларусі, таму што імі не была атрымана акрэдытацыя Міністэрства замежных спраў. У найбліжэйшы час будзе дадзена вычарпальная ацэнка дзейнасці журналістаў НТБ, запэўнілі ў Мінінфарме.

**БЕЛТА.**

## РАКАВОЕ ДРЭВА

Трагедыя адбылася ў імгненне вока. Наляцеў моцны вецер, зламаў аграмадную галіну векавога дуба, якая ўпала на людзей, што стаялі ўнізе. Дзве жанчыны 1952 года нараджэння загінулі, мужчына атрымаў траўмы і трапіў у бальніцу. Бяда здарылася ў вёсцы Вольна Баранавіцкага раёна, дзе чацвёра працаўнікоў Баранавіцкага камбіната харчовых прадуктаў фарбавалі агароджу размешчанага ў Вольнай участка па вытворчасці сокаў. Чацвёртая рабочая гэтай брыгады не пацярпела.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## МУТАЦЫІ ЯДОМЫХ ГРЫБОЎ У БЕЛАРУСКІХ ЛЯСАХ — НЕ БОЛЬШ ЯК ВЫДУМКА

Як патлумачыў старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі міколаг Яўген Юрчанка, толькі на моцна забруджаных радыяцыяй тэрыторыях былі адзначаны адзінкавыя выпадкі, калі споры некаторых відаў грыбоў станавіліся больш буйнымі. Але такія змяненні могуць заўважыць толькі спецыялісты. І няпраўда, што з-за гэтага ядомыя грыбы становяцца атрутнымі.

**Міхаіл МІХАЙЛАЎ,** *«Мінск—Навіны».*

